**АХОВА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК ШЛЯХ ДА КУЛЬТУРНАЙ БЯСПЕКІ Ў XXI СТАГОДДЗІ**

ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, магістранты, аспіранты і выпускнікі ўніверсітэта, калегі з іншых навучальных устаноў і навукова-даследчых цэнтраў, носьбіты і пераемнікі фальклору! Мне вельмі прыемна звярнуцца да вас з нагоды адкрыцця юбілейнай – X Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай аўтэнтычнаму фальклору!

У 2007 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў заклаў традыцыю правядзення веснавога навуковага форуму, канцэптуальна прысвечанага праблемам аховы і пераемнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. У яго стратэгічным перспектыўным планаванні акцэнт быў свядома зроблены на комплексным і сістэмным вывучэнні ўсіх праяў і граняў аўтэнтычнага фальклору і аналізе шляхоў яго інтэграцыі ў мастацкія, адукацыйныя і паводзінныя рэаліі XXI стагоддзя. За мінулыя дзесяць гадоў – з 2007 па 2016 – наша канферэнцыя прайшла паслядоўны і плённы шлях ад навукова-метадычнай сустрэчы беларускіх фалькларыстаў да грунтоўнага міжнароднага навуковага форуму, які складаецца з: сур'ёзных аналітычных паведамленняў і дыскусій філолагаў, мастацтвазнаўцаў, культуролагаў і антраполагаў Усходняй Еўропы; этнаграфічных канцэртаў носьбітаў каранёвага мастацтва нашай Радзімы; майстар-класаў лепшых спецыялістаў-пераемнікаў традыцыйнай культуры з розных краін; мастацкіх рэканструкцый традыцыйных свят і абрадаў Беларусі.

Наша канферэнцыя – заканамерны працяг эвалюцыйнага руху ўніверсітэта культуры і мастацтваў, які сёлета ўступіў у пятае дзесяцігоддзе сваёй біяграфіі, па шляху ўстановы з трывалымі акадэмічнымі традыцыямі і сувязямі, якая дае рознабаковую гуманітарную адукацыю. Менавіта гэта забяспечвае канферэнцыі ўніверсальны, антрапалагічны падыход да фальклору, які неабходны для яго захавання ва ўмовах глабалізацыйнага выкліку XXI стагоддзя. Наш час паставіў шмат праблем не толькі перад фальклорам розных народаў, але і перад чалавецтвам увогуле. Глабалізацыю, якую часам вітаюць як пераход грамадства на якасна новы ўзровень жыцця, многія навукоўцы і метадолагі навукі лічаць не зусім паслядоўнай спробай штучна і прэвінтыўна ўніфікаваць сусветную культуру. Міжнародная супольнасць відавочна занепакоена гэтым і, каб захаваць культурную разнастайнасць, імкліва бярэ пад ахову фальклорную спадчыну розных народаў. Менавіта так з'явіліся разнастайныя ахоўныя спісы вуснай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, якія складае ЮНЕСКА і кожная з цывілізаваных краін Свету. Варта адзначыць, што ад Беларусі ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва ўключаны адзіны элемент – абрад Калядныя Цары з Цэнтральнай Беларусі. І кантэнт для яго ўключэння ў гэты прэстыжны і эксклюзіўны ў сусветным маштабе спіс разам з этнографам Таццянай Кухаронак, тагачасным старшынёй Рэспубліканскага Бюро ЮНЕСКА Уладзімірам Шчасным і аўдыявізуальным антраполагам Рэгінай Гамзовіч у 2009 годзе рыхтавала кафедра этналогіі і фальклору нашага ўніверсітэта.

На першай канферэнцыі 2007 года прысутнічаў старшыня Сакрытарыяту канвенцыі па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны Парыжскага бюро ЮНЕСКА Рыкс Сміт, і тыя напрамкі дзейнасці, якія стартавая канферэнцыя акрэсліла, паспяхова і плённа інтэграваліся ў дзейнасць універсітэта. «Ідэі лунаюць у паветры», – кажуць філосафы, і невыпадкова цалкам ў рэчышчы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны мы шмат год рыхтуем спецыялістаў па шэрагу спецыяльнацей і спецыялізацый, якія накіраваны на захаванне такіх праяў каранёвай культуры, як аўтэнтычныя спевы, дударская музыка, народныя промыслы і рамёствы, народныя абрады і святы, народны танец. Нашыя выпускнікі, якія атрымалі этнамастацкую адукацыю, атрымліваюць узнагароды на мастацкіх фестывалях і прызы ў конкурсах работ маладых навукоўцаў. Яны стажыруюцца і працягваюць адукацыю за мяжой, у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, і сапраўды з'яўляюцца дастойнымі пераемнікамі справы жыцця сваіх выкладчыкаў-беларусістаў.

Аўтэнтычны фальклор уяўляе сабой гарманічна арганізаваную сістэму мастацкага пераасэнсавання жыццёвых правілаў, норм, вераванняў, рытуалаў, якія абумоўлены асаблівасцямі самазахавання этнасу ў розныя гістарычныя часы, у ім «закадзіраваны» алгарытм трансляцыі народу скрозь час і прастору. Таму сёння вам варта пажадаць плённай працы, новых адкрыццяў ва ўсіх галінах навукі, якія прысвечаны народазнаўству: у *этналогіі, філалогіі, аўдыёвізуальнай антрапалогіі, мастацтвазнаўстве, культуралогіі*. Я шчыра жадаю плёну ўсім беларускім удзельнікам канферэнцыі, нашым гасцям з суседніх сяброўскіх краін, фальклорным калектывам, якія завіталі да нас і бяруць удзел як у навуковай рабоце, так і ў творчай, мастацкай праграме канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» 2016 года!

Прафесар, рэктар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Юрый Бондар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ